колькасць вяселляў. Ураджай быў сабраны, і можна было гуляць сямейныя ўрачыстасці. Адметнай рысай такіх восеньскіх твораў з'яўляецца абавязковая прысутнасць у іх сонца, якое быццам бы да драбніц перадае настрой закаханых: «А на гарэ дуб зялён кудравісты, // Іграй сонца із зарою. // А на тым дубочку // Ганначка сядзела, яна песню пела» [6, с.168]; «Ды на полі ліпа з сонейкам іграець, // Рана, рана! // Малады маладзец коніка сядлаець, // А старшы брацітка яго намаўляець: // - Выбірай, брацітка, на ніўцы, // А не выбірай, брацітка, на рынку: // На рынку дзевачкі хваслівы, // А на ніўцы дзевачкі працаўлівы» [6, с.154].

Гучыць у восеньскіх песнях і згадванне аб нешчаслівым замужжы. Даволі часта гэта можна растлумачыць бяспраўным становішчам жанчыны ў сям'і. Нягледзячы на тое, што сілы прыроды, а часцей усяго сонца, спрыяюць жанчыне-працаўніцы, яна не заўсёды можа пахваліцца асабістым, сямейным шчасцем: «– Маё шырокае падвор'е, // Чаму вадою заплыло? // Ці табе сонца замала? // – Свяціла сонца ў ваконца, // Павеяў ветрык з загор'я // На маё нізкае падвор'е. // – Маладая дзевачка, чаго ты замуж хацела? // Ці бацькава роскаш дадзела, // Ці ад людзей павагі не мела? // – Была мне роскаш у татачкі, будзе павага ў свякроўкі, // Будзе знявага ў мілога» [6, с.196]; «Эй, за лес сонца закацілася, // Эй, донька ў мамкі загасцілася… – Ой, выела вочкі замужжайка, // Ой, выдрала вочкі падружжайка, // Ой, спутала ножкі падружжайка, // Ой, спутала ножкі замужжайка» [6, с.227]. Відавочна, што перамога над горам, сямейнымі неладамі асацыіруецца ў восеньскіх песнях з жаркім сонцам і яго бляскам: «…– Тады ў госці буду, як гора забуду, // А ў леце ў карэце // Ад жаркага сонца…» [6, с.251].

Як бачна, працоўная абраднасць беларусаў мае ў сваёй аснове традыцыі надзвычай даўняй старажытнасці, яна прасякнута салярным культам, які ўскладняўся яшчэ і спалучэннем са своеасаблівым дамінуючым земляробчым культам. Таму ў жніўных абрадах і песнях сонца паўстае як адвечная міфалагічная крыніца цяпла, жыцця і ўраджаю, заступнік абяздоленых сялян-працаўнікоў, які пастаянна дапамагае ім у каханні, пры вырашэнні складаных сямейных пытанняў, мае нават пэўнае матэрыяльнае выражэнне ў выглядзе сонечна-залатога зерня, калосся, хлеба, або сплеценага на свята вянка-кола. А восеньскі цыкл у гадавой абраднасці беларусаў выконвае функцыю «завяршальных дзён» працоўнага перыяду, калі, на думку першапродкаў, сонца памірае, а сабраны ўраджай сімвалізуе яго далейшую жыццядайнасць, з чым і звязана даволі распаўсюджаная тэматыка вясельна-сямейных сюжэтаў у восеньскіх песнях.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**


1. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Брэсцкая вобласць / Склад. В.А. Захарава. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1973.–302 с.
2. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / Уклад. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка, музычнай часткі – У.І. Раговіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1989.– 302 с.
3. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / Уклад. В.Д. Ліцвінка. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 302 с.
4. Богданович А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: Этнографический очерк (Репринт. изд.).– Минск: Беларусь, 1995. – 186 с.
5. Варлыга А. Чатыры ўрачыстасці. – Нью – Йорк: Заранка, 1970. – 53 с.
6. Восеньскія і талочныя песні / Склад. А. Ліс, уклад. С.Т. Асташэвіч; муз. часткі В.І. Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 678 с.
7. Жніўныя песні. Рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 816 с.
8. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі. – Мінск.: Навука і тэхніка, 1990. – 440 с.
9. Зянько У. Спадчына маёй маці / Укл. В.Ліцвінка. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 303 с.
10. Карскі Я. Беларусы. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 640 с.
11. Коваль У.І. Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы: Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі. – Гомель: Беларускае агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1995. – 180 с.
12. Крачковский Ю.Ф. Быт западнорусского селянина. – М., 1874. – 212 с.
13. Ліс А.С. Жніўныя песні. - Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 238 с.
14. Ліс А.С. Песню – у спадчыну: Мастацтвазнаўчыя артыкулы. – Мінск.: Маст. літ, 1989. – 295 с.
15. Мажэйка З.Я. Песні беларускага Паазер'я. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – 150 с.
16. Романов Е.Р. Белорусский сборник. – Киев: Тип. Малкина, 1887. – Вып. 3. – 445 с.
17. Шейн П.В. Белорусские народные песни с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями. – СПб., 1874. – 548 с.
18. Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края // Сб. Отделения русского языка и словесности АН. – СПб. – 1887 – 1902. – Т. 1 –3.


УДК 882.6(092)

***Ненадавец А.М.***

# ТЭМА ПАЛЯВАННЯ Ў ТВОРАХ Я.ЛУЧЫНЫ (НА ПРЫКЛАДЗЕ "ПАЛЯЎНІЧЫХ АКВАРЭЛЬНІКАЎ З ПАЛЕССЯ")

Старыя людзі навучалі маладзейшых, што ні ў якім разе нельга пагарджаць спрадвечнымі правіламі палявання. Добра, што здаровы і вынослівы, пахвалёна, што адчайны і смелы, але ніколі не трэба забывацца, што з таго боку таксама паўстане дастойны сапернік. І вылезе з нетры ці са свайго логава ён не проста для таго, каб напалохаць або папярэдзіць. Звер рэдка калі даруе промах, хіб ў паводзінах. Ён з парушальнікам свайго спакою разлічваецца жорстка і бязлітасна. Кожны з паляўнічых, вядома ж, прыкрывае ўласны пралік нейкай сямейнай ці сацыяльнай неабходнасцю. Так і ў Грышкі (галоўнага героя) атрымалася.

Я й думаю сабе: галубцы вось Уляне
Адзін мядзведзя паспрабую аблажыць,
Каб сведкі мне не мець, паклапачуся скрыць,

***Ненадавец Аляксей Міхайлавіч***, *доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры Грамадскіх дысцыплін БФ УА "БДЭУ".*
*Беларусь, 213826, г. Бабруйск, вул. Савецкая, 77/ 48.*

Прадам я жыду скуру, дык і будуць грошы [1].

Распазнаваючы гэтакім чынам дапамагчы сям'і любай ім дзяўчыны, Грышка нават не задумваўся на якую смяротную небяспечную справу выпраўляўся. Тым болей, што кіраваў сам-адзін, без падстрахоўкі.

Я.Лучына настолькі дынамічна, высокамастацка перадае сцэну імклівага паядынка, што здаецца быццам бы бачым усё гэта на ўласныя вочы, ці нават самі ўдзельнічаем у тым паляванні.

Рванула сука вераўчаны смык… Мой пане!
Капою сена блізка ад мяне як бач
На чалавечы рост падняўся быў кудлач.
Аж ногі задрыжэлі! Сука бязупынку
З рук рвалася, спусціў з смыка, сам да хваінкі
Адскочыў. І за стрэльбу! Цэліцца – ды стоп!..
Пайшоў, за ім там сука і за лыткі хоп.
Мядзведзь раве, ўцякае!.. падае нарэшце
Ў гушчар, пасля – на месцы трэскат, сука брэша.
Забег і падпусціў, узяў у лоб – палю!
Мядзведзь прысеў і лапамі – за лоб, а потым
Галопам – проста на мяне! За дуб я – лётам!
Пайшлі вакола ў скокі дуба мы таго.
За зверам сука, як на шчасце, бо яго
Здагоніць і скубе. Скачу я ўлева, ўправа.
"Тваёй ахове аддаёмся…" – паўтараю.
Тут – бах! – стрэл грымнуў.
Татка мой спусціў курок
І пад лапатку кудлачу ўсадзіў пянёк.
Той духу не ўказаў!
Да ног упаў быў таты (68).

Вось так, з-за ўласнага азарту і спрыту, надзеі на нечаканае паляпшэнне матэрыяльнага становішча, Грышка ледзьве не стаў ахвярай свірэпага мядзведзя. І невядома яшчэ як бы яно склалася, каб не бацька, які, западозрыўшы нешта няладнае, прасачыў за сынам. Ягоны вопыт, трапнасць стрэлу, цвёрдасць рукі якраз-такі і разрадзілі сітуацыю – паклалі звера. Малады паляўнічы таксама не прамазаў, ён даў прамашку ў іншым і зразумеў гэта ўжо потым, але затое на ўсё астатняе жыццё.

Сказаць забыўся панічу, а як па стрэле
Было маім. Аж люба. Куля ў лобе села,
Ды не пайшла, а знесла з чэрала якраз
І скуру й кудлы, не раўнуючы як пас.
Пянёк браць толькі трэ, як мець з мядзведзем справу.
Пад вуха цэліць, кулі круглае не раю… (69).

"Пянёк", пра які пару разоў згадвае Грышка, - гэта куля асаблівай цыліндрычнай формы з завостраным канцом, якую спецыяльна адлівалі для палявання на буйнога звера. Лічылася, што такая куля не саслізне ніколі, у адрозненне ад круглай, а ўвап'ецца нават у жалеза.

Увогуле, паляўнічыя любяць разважаць-гаманіць пра свае стрэльбы. Але, што самае дзіўнае, пасля прачытаных радкоў ствараецца ўражанне, што не яны галоўныя ў змаганні са звярамі, а .. людзі. Стрэльба можа быць надзвычай старой, амаль разламанай. Але чалавек верыў у яе, спадзяваўся, быў перакананы, што ў патрэбны момант яна, ў каторы ўжо раз, зноў выручыць. І таму не дзіўным тут здаецца спалучэнне: "Віселі стрэльбы, торбы ўсякія ў куточках, Рагаціна ў куце выстойвала адна, То ж ловы на мядзведзяў помніла яна" (59). І стрэльбы, і рагаціна – паляўнічая зброя. Яны зарадзіліся ў розныя эпохі, але аднолькава верна служылі ў цвёрдых, магутных руках продкаў. Пан адчытвае старога паляўнічага: "Казёл!.. На кудлача збіраешся, няйначай, Дык стрэльбу добрую вазьмі, а не ламачча, Бяры ці дубальтоўку вось, цт штуцэр мой, Што лепш да вока…" (87). Але ж і Грышка таксама разважае па-свойму, бо ў яго свая, няхай сабе і патрыярхальная, але ж логіка. Ніхто яго ў іншым не пераканае, бо як гэта адмовіцца адразу ад таго, што не адзін раз цябе выратоўвала, услаўляла сярод аднагодкаў і сародзічаў. Яму гэта не зразумела, таму і стаіць на сваім, таму і ўпарціцца:

Не трэ, паночку, не, хай укрывае Божа!
Не ўмею з панскай стрэльбы, ў клеці ёсць свая,
Папсулі дзеці, дык паправіць мусіў я.
Пальне!.. – бы ў свечку ясную! Бо анікрышку
З старой знаёмай стрэльбы не спудлуе Грышка (87).

Нават выпрабоўваючы маладзёнаў, якім карціць хутчэй падацца ў пушчу, каб там паказаць на што яны вартыя, вопытны паляўнічы экзаменуе іх па самым простым – веданні стрэльбы, ды назваў дэталяў, з якіх яна складаецца:

"Ну й паляўнічы ў нас – на камароў яму!
Ці ў стрэльбе помніць што?.. Хто веры дасць таму?
Хай пан адкажа нам!" –
"Курок.. шчэ шомпал, трубка". –
"Ха! Ха! Названа драбяза – забыта рулька,.." (78).

Цікава будзе прасачыць і за тым, як палескія паляўнічыя замаўлялі свае стрэльбы на трапнасць і далёкасць бою. Вось што пра гэтую акалічнасць пісаў Ч.Пяткевіч: "Калі пасля трапнага стрэлу зверына на працягу пэўнага часу, а часам і даволі доўга жыве, гэта сведчыць пра загану зброі, што сярод паляўнічых называецца: стрэльба жывіць. Жадаючы пазбыцца гэтай заганы, трэба ўпаляваць чайку, вырваць з правай лапы ўсе кіпцюры і па адным пазакладваць за аблупленую кару ў асінах. Як толькі пасля некаторага часу адно з гэтых дрэў ссохне, неабходна дастаць кіпцюр – той, якім наносіліся смяротныя ўдары рыбам, і прымацаваць яго пад ствалом, каб не выпаў. Стрэльба, атрымаўшы такі амулет, будзе ўкладваць зверыну на месцы, нягледзячы на адлегласць.

Чарадзейную моц надаюць паляўнічай зброі і іншым чынам: прымушаюць чорную змяю запаўзці ў дула набітай стрэльбы (загнаць гадзюку) і як толькі ўдасца гэтага дасягнуць – страляюць. Пасля праведзенай аперацыі адлегласць і жывучасць зверыны не існуюць для стрэльбы. а самае галоўнае – яна не баіцца чаравання. Здараліся, кажуць, выпадкі, калі дула разрывалася падчас стральбы – з-за таго, што між змяёю і набоем часта заставаўся вакуум. Выканаць гэтую аперацыю надзвычай цяжка. Але, нягледзячы на гэта кожны паляўнічы, прынамсі, кожны з іх, нават маючы добрую стрэльбу, імкнецца палепшыць яе апісаным вышэй спосабам"[2].

Паляўнічыя верылі таксама і ў тое, што стрэльбу, як і чалавека, можна вельмі проста сапсаваць, зрабіць "нятрапнай", "няб'ючай", "непатрапейкай" і г.д., каб выправіць становішча спрактыкаваныя не толькі паляўнічыя, але і варажбіты раілі наступнае: "Стрэльба можа сапсавацца ад страляння ў ката і тады, калі паляўнічы не падымае забітай жывёліны асабіста, а камусьці даручае гэта зрабіць.

Жадаючы наладзіць сапсаваную згаданым вышэй спосабам стрэльбу, паляўнічы павінен на тры дні закапаць яе ў свіным гноі альбо пакласці ў хаце каля парога так, каб з раніцы, першы раз баба, ідучы да ветру, пераступіла цераз яе.

Калі стрэльба дрэнна б'е з той прычыны, што ў ёй сядзіць чорт, то часам дастаткова вымыць яе адварам з маладой асіны. У выпадку найбольш сур'ёзнага зачаравання стрэльбы самім чараўнікам выкарыстоўваюць закляцце, адначасова мыючы дула з нутры ў бягучай вадзе пры дапамозе вычасак, накручаных на канец шомпала"[3]. Умелі, ведалі палешукі-стралкі многае. І калі ўжо браліся за справу, няхай сабе і самую важную, самую небяспечную, то рабіць яе стараліся сумленна і бездакорна. А ў такім занятку галоўным было тое, каб побач быў надзейны сябар, правераная стрэльба ў руках, ды "драбнюткі, нібы пыл", порах. Лічылася, што менавіта гэтая драбната і з'яўлялася паказчыкам моцы і сілы, якая потым будзе скіравана на звера.

Старыя паляўнічыя распавядалі пра розныя дзівосы, якія здараліся (нібыта з імі самімі, ці пра гэта ім – гаварылі такія асобы, якіх усе у наваколлі ведалі) ў пушчы ды бары падчас

[1] *Янка Лучына. Творы. Мн., 1988.с.67. У далейшым усе спасылкі на «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся», даюцца на гэтае выданне, у дужках – старонка.*

[2] *Ч.Пяткевіч. Рэчыцкае Палессе. Мн., 2004.с.494.*

[3] *Ч.Пяткевіч. Рэчыцкае Палессе. С. 494-495.*

ловаў, аблаваў, засадаў. Вядома ж, тут адчуваецца магутны налёт прымхлівасці, цемрашальства, але, разам з тым, які цудоўны палёт фантазіі, які ўзор паляўнічага фальклору. Усё падаецца так, што пачынаеш верыць у рэальнасць тых здарэнняў, бачыць тыя фантастычныя пераўтварэнні, лякацца вычварных зданяў, якія стануць палохаць з-за дрэваў і кустоў.

Лічылася, што ні ў якім разе, накіроўваючыся ў лес нельга згадваць “шатана ці русалак”.Хто не верыў у такое прадказанне і спрабаваў праверыць на сабе, то вельмі хутка пераконваўся ў тым, што за лепшае трэба было прыслухоўвацца да старэйшых.

Шатана ці русалак бачыў ты хіба”?-
“Фу…цьфу! …Панічу! Ну навошта пахвальба?
Нібыта не баіцца сілы пан нячыстай?!
Мо тут шатан сядзіць на хвоі дзе камлістай!
Нячысціка ды клікаць?! У імя Айца!..
Мы тут ў пушчы, а не ў хаце свячанай!..Жыцця
Яе не перадаць…гм!..кніжкі пан чытае
І верыць, што бязлюдны лес душы не мае? (73)

Свет у цэлым уяўляўся старажытнаму чалавеку адухаўлёным, і дрэвы, пушчы, вядома, не склалі выключэння. Наш продак верыў у тое, што дрэвы маюць душу такую ж, як і ў людзей, і з гэтай нагоды пакланяўся ім, а ў цёмны час сутак і на самой справе палохаўся. Дрэвам надаваліся розныя цудадзейныя уласцівасці. Адухоўленыя дрэвы, лічыў патрыярхальны паляшук, валодаюць пачуццямі. А раз так, то на іх жывуць яшчэ і міфічна –фантастычныя істоты, якіх чалавек проста не заўважае, але ў пэўны момант яны ажывуць, пакажуць свой жахлівы выгляд, напоўняць пушчу жудаснымі галасамі.

Далёкія прашчуры былі перакананы ў тым, што сама душа зямлі ходзіць лесам і кажа: “Сячыце, сячыце! Не будзе дрэваў і мяне не будзе!”.[4]

Гэты лес, пушча, бор былі для палешука жывымі.

У іх жыццё не спынялася ні на хвіліну. Проста яно ішло так, што ніхто не мог гэтага заўважыць. Адзінае, што яму вельмі хутка ўдавалася – сустрэцца з нейкай міфічна-запалохваючай істотай. І гэта тады паўстае, як магічны працяг узаемаадносін такога паляўнічага з прыродай. Цябе, маўляў, папярэджвалі, а ты ўсё не верыў, вось цяпер пераканайся сам. З такой праявай сутыкнуўся і паніч – найлепшы сябра Грышкі. Праўда, тут Я.Лучына дадае яшчэ адзін аспект - калі першым чалавек не зачэпіць звера (якім бы моцным ён не быў), то той пастараецца таксама не прычыніць зла, абыйсці бокам.

Чалавек, які ўсё жыццё правёў на ўлонні роднай прыроды, палясоўшчык, які арыентаваўся ў пушчы амаль так, як і ва ўласнай хаце, паляўнічы ад Бога, узбагачаны агромністым практычным вопытам, тым не меней, не мог прама адказаць на пытанне адносна існавання нячысціка (чорта). Перш за ўсё таму, што пазбягаў адназначнага адказу. З аднаго боку, за працяглы час з ім усялякае здарылася ў пушчы, і далёка не ўсё чалавек мог растлумачыць, а з другога – Грышка баяўся адмовіць прысутнасць у пушчы нейкіх фантастычных істотаў. Як жа можна такое зрабіць? Нават уявіць? Каб лес ды быў без лесавіка (лешака), а балота – без чорта? Менавіта пра гэта сцвярджалі прадзеды, гаварылі дзяды, перадавалі бацькі. Гэта ішло з пакалення ў пакаленне і, здавалася, што на ім увогуле не адчувалася ўплыву сацыяльна-эканамічных зменаў. Як жа палясоўшчык мог адмовіцца ад традыцыі? Такога не здарылася б ніколі , бо стары паляшук увогуле выступаў не супраць старога, аджыўшага, а, наадварот, супраць новага. І нейкія змены ў ягонай галаве адбываліся надзвычай марудна. Таму і гучыць з вуснаў Грышкі нешта няўцямна-непераконваючае

Учора запытаўся пан,
Ці ў пушчы часам Грышку не спаткаў шатан?
Гм!..Што ж сказаць на гэта?! Кпяць за кожным разам
З нас, прасцякоў, панове…Трасца й ёсць жа назва
Таго вось ліха…

…Што да чорта?
Ці ёсць? Не знаю…Пан па гутарцы такой
Хай будзе асцярожны ў глыбіні лясной…(74).

Гэтыя самыя “шатаны-нячысцікі”, жывучы ў пушчах, па перакананні Грышкі, як найбольш улюбёнага Я. Лучынам прадстаўніка палешукоў, нават дапамагаюць людзям. Асабліва тым, хто верыць (а не сумняваецца) ў іхняе існаванне. Хто здзяйсняе ўсё па заведзенаму ад веку парадку. Палясоўшчык лічыў, трымаючыся павер’яў продкаў, што калі на Куццю (пра якую мы ўжо згадвалі) прамазаць са стрэлам, то і на працягу ўсяго года на лепшае можна нават не спадзявацца. І тут без “ласкі” нячысцікаў, вядома ж, не абыходзілася. Затое, калі “не даў пудлу”, то можна было страляць не цэлячыся, не прыкладваючыся, па любому зверу ці птушцы, а забітымі будуць падаць толькі найбольш жаданыя на паляванні, “Пасыпалася шчасце мне, як з меха зерне. Сава! – гляджу раз...луп! а падае цяцерка”. (55).

У Грышкі ёсць і пэўныя парады-прыкметы, якія ён імкнецца ў абавязковым парадку паўтараць (ці не паўтараць нават пад прымусам!) перад выхадам на паляванне. Яны датычыліся любога боку справы. Нават ежы. Ведаю гэта дакладна, бо некалі мяне навучаў мой дзядуля – таксама адмысловы паляўнічы, што, маўляў, зімою, не пакаштаваўшы гарачай стравы, нельга выходзіць з хаты, бо на марозе хутка вельмі “дасі дуба”- замерзнеш, а з такога чалавека – нікчэмны стралок. Тое ж самае і ў Грышкі: “На яе, Як чар, стары тут Грышка радзіў бы свае Спажывы з’есці цёплай…” (74). Вельмі сурова гаспадар хаціны “адчытвае” пана – не зважаючы на яго становішча – за тое, што той за сталом займаецца неадпаведнай справай. Прымхлівасць гэтая звязана з хлебам – святой істотай для любога палешука. Менавіта істотай! Жывой і шануемай усім родам і любым у гэтым родзе:

“Нялюдскую забаву кіньце лепш, панічу,
Паслухайце старога, вам дабра я зычу,
У галкі хлеб круціць – недаравальны здзек.
Гм! Дар ён Божы,
Хлеб – шаноўны госць спрадвек,
І пакланіцца за сталом яму належыць,
Каб з хлебам леташнім штогод спаткаўся свежы.
Калісьці, помніцца, нябожчык наш сваяк,
Абы пабачыў, галкі хто круціў вось так,
Ці свой там, ці чужы, - не выпускаў ніколі,
Мне вуха надарваў за гэткую сваволю.
Цяпер я за яго душу за ўчынак той
Штодня, паніч, малюся: Вечны супакой!..(65).

Тут Грышка, нібыта падсвядома, раскрывае адну з асноўных прычын палявання, тую, якая абудзіла паляўнічы азарт некалі ў нашых далёкіх продкаў, - голад, патрэбу ў штодзённай ежы, неабходнасць пракарміць сям’ю, род, тым самым выратаваць ад непазбежнай смерці. Патрыярхальным людзям не раз і не два даводзілася гэта зведаць. Таму страх гэты стаў генным, пра яго перадавалі з пакалення ў пакаленне. Лічылі, што ўсе павінны ведаць абавязкова да чаго прыводзіць страшэнны голад.

Тое, што не даядалі кожны дзень, елі нішчымніцу – гэта адно, а вось тое, што пухлі з галадухі, вымiралі цэлымі сем’ямі, паселішчамі, вымушаны былі зрывацца з наседжаных месцаў і ісці ў свет жабраваць, каб хоць кагосьці ўратаваць для працягу роду – гэта зусім іншае. Кожнаму амаль што старому чалавеку было пра што прыгадаць, пераказаць маладзейшым. І галоўнае ў тым, што іменна старэйшыя лічылі асноўнай прычынай любога голаду пакараннем божым за нейкія грахі людзей, а то і паасобных індывідаў з чалавечага роду. Таму так пільна сачылі, каб не парушалася што ў адвечным парадку, няхай сабе і седзячы за сталом. Лепей наперад засцерагчыся, чым потым аплочваць такою дарагою цаною.

Вось гэтак – Бог замкне сваю спіжарню!
То ж кара за грахі, як глуміць хто дары,
Не верыць моладзь, хоць і скажа ёй стары (65).

Вось тады і выратоўваў лес, спрыяла і дапамагала пушча, браў пад сваю ахову бор. Дзе якія ягады, дзе якія птушкі,

[4] *Караткевіч Ул. Творы: У 8т.Мн., 1991.т.8.кн.1.с.429.*

звяры, якіх мог знайсці чалавек, упалязваць, злавіць у сілкі, дапамагалі.выжыць. Тут, у такой сітуацыі, чалавек адчуваў сапраўдную ролю свайго зялёнага сябра, па-новаму ўспрымаў значэнне лесу, бо, не сакрэт, што калі не было пільнай парэбы, дык многае магло і забыцца ад першапачатковага ўяўлення пра пушчу. Для чалавека гэта характэрна, што пра нешта важнае пры наяўнасці менш значнага, можа проста не памятаць, "абыходзіцца без яго". У такіх выпадках аднаўлялася чысціня, натуральнасць узаемаадносін нашага продка і лясоў. Можна па-рознаму тлумачыць гэтую сувязь (падаваць яе), але яна як была, так і ёсць, так і будзе. Лес абавязкова падтрымае, "У нас былі на тыя часы, ў каморы ў таку хоць нейкія запасы, маглі падацца, зрэшты, стрэльбу ўзяўшы, ў бор" (87).

Ацэньваючы ў цэлым ролю "Паляўнічых акварэлькаў з Палесся" Я.Лучыны для тагачаснай беларускай літаратуры, ды і для сучаснай таксама, абавязкова адзначым, што гэтак хораша, азартна, з веданнем справы і падрабязнасцей гэтага рамяства ні да яго, ні пасля яго ніхто не перадаваў у мастацкім творы. Паэт здолеў данесці, раскрыць унутраны свет палешука, паказаць наколькі цесна гэты чалавек быў злучаны з прыродай, як тонка ён яе адчуваў і што нават не ўяўляў свайго далейшага жыцця без яе існавання.

УДК 801.731

***Пікула Л.У.***

# АСЭНСАВАННЕ ВЕРША "VITA BREVIS. PATRIA ETERNIS" НІНЫ МАЦЯШ

Пажадаў дабра мне друг зычлівы.
Добра мне.
Дзень, адмалку на журбу ўрадлівы,
У цане.

Ах, не час валошкавы мой тае –
То пылок
З трапятлівых крыльцаў асыпае
Матылёк!..

Vita brevis. Patria eternis.

Зорны цвет
Чалавечых дум аб шляху ў цернях,
Запавет.

Як не выйду больш на васільковы
Я парог –
Пагукай безмежжа гэтых словаў
Чатырох...

1989



Паэзія Ніны Мацяш – неацэнны скарб нацыянальнай культуры, духоўных, маральна-этычных каштоўнасцяў. Ствараючыся ў духоўных вымярэннях, паэтычны свет набывае духоўна-чалавечы змест. Таму яе вершаванае слова абуджае думку, пабуджае разам з лірычнай гераіняй весці пошукі маральнай ісціны, далучацца да народнага вопыту, пераадольваць недасканаласць.

"Філасофскі падыход да жыцця, філасофскае асэнсаванне рэчаіснасці – гэта ў большай ці меншай ступені ўласціва любому пісьменніку, які творыць па ўнутранай неабходнасці, душой і сэрцам. Філасофскі роздум уласцівы таксама людзям, якія сутыкаюцца з сапраўднымі праблемамі, з сапраўднай жыццёвай драмай, людзям, якія на самой справе пакутуюць і перажываюць. Пісьменнік - філосаф – гэта, як правіла, у нечым няшчасны чалавек. "[1, ст.6].

Лірызм паэзіі Н. Мацяш мае драматычны характар. Адчуваецца, што да канца зведана, перажыта тое, пра што напісана. Творы паэтэсы кранаюць "натуральнасцю душэўнай страсці, яе нявымучанасцю ва ўгоду фармальным кампанентам верша."[2, ст.30].

"Я ніколі не вытузваю з сябе вершы, я іх проста чакаю", [3, ст.3] – прызнаецца Мацяш. А чытач ці сінхронна з аўтарам перажывае змест, ці, што здараецца, відаць, часцей, разумее выкладзеныя мастаком слова думкі ў адпаведнасці са сваім уласным вопытам.

Думаецца, аўтар, калі творыць, не заўсёды здагадваецца, які ідэйны змест, падтэкст, галоўную думку вылучыць крытык у яго творы, але прапануем сваё асэнсаванне аднаго з вершаў.

Адметнае месца ў лірыцы Ніны Мацяш займае верш "Vita brevis. Patria eternis". Своеасаблівую функцыю выконвае назва, якую варта ўмоўна назваць ідэйным цэнтрам твора. Vita brevis. Patria eternis – Жыццё кароткае. Радзіма вечная. Гэты лацінскі афарызм пакладзены ў аснову верша Ніны Мацяш. Вечныя пытанні быцця з'яўляюцца важнымі для лірычнай гераіні. На нашу думку, фундаментам жыцця яна называе вернасць Радзіме. Гераіня (на наш погляд – сама аўтарка), на лёс якой выпалі пакуты, выпрацоўвае свае жыццёвыя ідэалы, што існуюць у свеце здаўна. Нездарма выказаны яны не на роднай паэтцы беларускай мове, а на адной з самых старажытных моў свету– лацінскай, – што сведчыць пра даўняе існаванне гэтага афарызма, пра тое, што сама паэтка – не першапраходца ў гэтым сэнсе, а толькі праз сваю прызму бачання сцвярджае спрадвечныя ісціны. Яна адна з многіх. Толькі пясчынка ў моры такіх жа маленькіх, як і сама. Але маленькая толькі ў параўнанні з даўнімі ісцінамі, якія пераходзяць з аднаго пакалення ў другое, нягледзячы на рух часу.

***Пікула Людміла Уладзіміраўна***, *выкладчык кафедры замежных моў эканамічных спецыяльнасцей Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта.*
*Беларусь, БДТУ, 224017, г.Брэст, вул. Маскоўская, 267.*